СУСТРЭЧЫ




# СОЛА Ў КАМПАНІІ СЯБРОЎ

**ЛІДА. Чарговая сустрэча адбылася ў літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», што дзейнічае на базе кніжнай крамы «Книжный мир» горада Ліда. Сваю творчую вечарыну для лідскіх калег і аматараў літаратуры правёў госць з Гродна, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык.**

Літаратар падрыхтаваў імправізаваную выставу сваіх публікацый у альманахах, калектыўных зборніках і перыядычным друку за некалькі апошніх гадоў. На працягу гадзіны доўжылася сольнае выступленне госця, у межах якога творца ладзіў прэзентацыі некаторых выданняў, дэкламаваў паэтычныя творы з разрадаў духоўнай, грамадзянскай, філасофскай і інтымнай лірыкі, дзяліўся навінамі літаратурнага жыцця, адказваў на пытанні слухачоў. І атрымліваў у свой адрас сардэчныя сяброўскія кампліменты... А як жа інакш, – паміж лідскімі і гродзенскімі пісьменнікамі ўсталяваліся цёплыя сяброўскія ўзаемаадносіны; колькасць аўтараў з Гродна, якія наведалі з прэзентацыямі сваёй творчасці літаратурную гасцёўню «Выхад у свет», імкліва расце. А Дзмітрый Мікалаевіч Радзівончык выконвае своеасаблівую місію рэзідэнта, функцыю куратара праекта ў Гродне, суправаджае, прадстаўляе на традыцыйных сустрэчах у Лідзе ўсё новых аўтараў з абласнога цэнтра. Гродзенскага паэта тут даўно ведаюць. Некаторыя сучасныя паэты з Ліды паспелі пазнаёміць са сваёй творчасцю гродзенскую аўдыторыю. Напрыклад, стваральнікі літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», паэты Руслан і Святлана Піваваравы. Як высветлілася, у суботу, 19 кастрычніка 2024 года праекту споўнілася 5 гадоў. Нагадаем, што на сённяшні дзень кнігарня «Кніжный мир» у цэнтры Ліды – адзінае ў



Гродзенскай вобласці прадпрыемства гандлю, на базе якога праходзяць літаратурныя сустрэчы. Кожны, хто трапляе на такую сустрэчу, пачынае адчуваць сябе неад’емнай часткай культурнага жыцця, непасрэдным удзельнікам складанага, творчага літаратурнага працэсу, далучаецца да грамадскай актыўнасці, пашырае свой кругагляд, атрымлівае ад аднадумцаў порцыю пазітыву, натхненне і добры настрой. На суботнія мерапрыемствы традыцыйна прыходзяць ветэраны працы, работнікі культуры і адукацыі, прадстаўнікі шырокай грамадскасці (падчас мерапрыемстваў крама працу не спыняе), члены гарадскога літаратурнага аб'яднання «Чертог поэта» і Лідскага раённага літаратурнага аб'яднання «Суквецце». 5-я ўгодкі літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» – не адзіная добрая навіна. Рашэннем Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі ад 18 кастрычніка 2024 года ў шэрагі СПБ прыняты адзін з ініцыятараў гасцёўні, лідскі паэт Руслан Піваварaў. Сардэчна віншуем!



Усё пачыналася 5 гадоў таму

З чаго ж складаўся тэматычны спектр сустрэчы? У сваім выступленні Дзмітрый Радзівончык згадаў сакральны вобраз маці (да Тыдня бацькоўскай любові), а таксама тэмы адзінства (да 85-годдзя ўз’яднання Усходняй і Заходняй Беларусі) і мірнага неба над нашай Радзімай (да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі). Не абмінулі і тэму літаратурнай крытыкі.

Працягнулі літаратурнае мерапрыемства лідскія калегі: Руслан Піваварaў, Святлана Піваварава, Ала Юшко, Валерый Мацулевіч, Алена Несцерава, Ганна Рэлікоўская, Вольга Высоцкая, Марына Сцяпанава, Таццяна Сямёнава, Ніна Кобец, мастак Аляксандр Буйкевіч. Выступленні лідскіх сяброў прысвячаліся асабістым жыццёвым уражанням, пачуццям, а таксама дням нараджэння класікаў – 225-годдзю з дня нараджэння А. С. Пушкіна, 210-годдзю з дня нараджэння М. Ю. Лермантава, вобразам Марыны Цвятаевай, Сяргея Ясеніна, Аляксандра Галіча. Неабходна адзначыць, што ў наступным 2025 годзе прыгажуня Ліда будзе прымаць XXXII Дзень беларускага пісьменства. Надыходзіць адказны момант максімальнай кансалідацыі і мабілізацыі літаратурных сіл Прынёмання.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота:** з прэзентацыяй сваёй творчасці ў літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» выступіў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Кніжная крама «Книжный мир». Ліда (Гродзенская вобласць), 19 кастрычніка 2024 года.









**Паэт Дзмітрый Радзівончык у Лідзе не ўпершыню**




**Традыцыйныя прэзентацыі кніг з Гродна**







**«Друзья мои, прекрасен наш союз! Он как душа неразделим и вечен…». Рэфлексіі ад аматара літаратуры, філолага Вольгі Высоцкай**



**Святлана і Руслан Піваваравы**



**Мастак Аляксандр Буйкевіч выказаўся на карысць больш цесных кантактаў паміж творчымі людзьмі**




**Супрацоўніцтва: аўтар кнігі і аўтар ілюстрацый да яе**


Таццяна Сямёнава


Валерый Мацулевіч


Паэтэса-педагог Ганна Рэлікоўская


Ала Юшко



Чытач Марына Сцяпанава



Паэтэса, мастачка Алена Несцерава




Прыемны падарунак – кніга паэтэсы з Ліды



**Члены СПБ, паэты Дзмітрый Радзівончык (Гродна) і Руслан Піваварaў (Ліда)**



**Дзмітрый Радзівончык**
**і Святлана Піваварава**






**Усе разам**






**Новая кніга – у падарунак госцю**



**Фота:**
Святлана Піваварава,
Руслан Піваварaў,
Дзмітрый Радзівончык
Андрэй Абрамаў

